21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Мільёны людзей яшчэ раз узгадваюць важнасць роднага, успамінаюць свае першыя словы, сказаныя на мове бацькоў, выказваюць павагу народу – стваральніку мовы. Як трапна адзначыў класік беларускай літаратуры Якуб Колас, «Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх мову».

Напярэдадні свята ў інтэрнаце №1 прайшоў тэматычны інфармацыйны час «Наша мова – наша спадчына, беражыце яе!». Яго мэта: захаванне і папулярызацыя беларускай мовы сярод моладзі, грамадскасці.



